Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
________ Н.У. Карчэўская
“28” _______ 2025 г.
Рэгістрацыйны № ВД-6-32-1/вуч.

# ЭТНАЛОГІЯ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*

2025

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.08.2023 №274, вучэбных планаў БДУКМ па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*А. А. Трусаў*, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Я. Л. Краснова*, вядучы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы "Цэнтр сістэмнага аналіза і стратэгічных даследаванняў" Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат культуралогіі;

*Н. Я. Петушко*, загадчык кафедры межкультурных камунікацый і рэкламы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 20.12.2024);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 26.02.2025)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль "Народазнаўства" складаецца з вучэбных дысцыплін "Этналогія" і "Этналогія Беларусі". Дадзеная вучэбная праграма прызначана для вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Этналогія".

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Этналогія" вызначаецца яе роляй у працэсе падрыхтоўкі музейных супрацоўнікаў, дае асновы ведаў аб развіцці этналогіі ў свеце і ў Беларусі.

Асноўная ўвага надаецца гісторыі этналогіі ў свеце, яе найбольш вядомым прадстаўнікам, якія працавалі ў XIX-XXI стст., а таксама даецца падрабязная характарыстыка матэрыяльнай і духоўнай культуры.

Мэтай выкладання вучэбнай дысцыпліны "Этналогія" з'яўляецца вывучэнне студэнтамі этнічных працэсаў; фарміраванне фундаменту этналагічных ведаў на падставе вывучэння дасягненняў сусветнай і айчыннай этналагічнай думкі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Этналогія" спрыяе падрыхтоўцы студэнтаў да практычнай дзейнасці, да больш паглыбленага аналізу і апісання розных відаў гістарычных крыніц. Авалоданне тэарэтычнымі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку спрыяе фарміраванню ўсебакова развітога спецыяліста ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Мэтавая накіраванасць вучэбнай дысцыпліны "Этналогія" прадугледжвае вырашэнне шэрагу задач:

– прасачыць на фактычным матэрыяле гісторыю станаўлення і развіцця этналогіі як навуковай дысцыліны;

– выявіць асаблівасці этнагенезу, этнасаў розных іншых краін і кантынентаў;

– вызначыць залежнасць развіцця этнасу ад культурных, палітычных, эканамічных і іншых прычын.

Зместам вучэбнай дысцыпліны "Этналогія" прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый:

УК-4 Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;

УК-7 Валодаць здольнасцю аналізаваць працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды, выяўляць фактары і механізмы гістарычных змен, вызначаць сацыяльна-палітычнае значэнне гістарычных падзей (асоб, артэфактаў і сімвалаў) для сучаснай беларускай дзяржаўнасці, у дасканаласці выкарыстоўваць выяўленыя заканамернасці ў працэсе фарміравання грамадзянскай ідэнтычнасці;

БПК-4 Інтэрпрэтаваць гісторыю сусветных цывілізацый, вызначаць асаблівасці этнічных супольнасцяў, культур і іх эвалюцыю, агульную сацыяльна-культурную сітуацыю;

БПК-5 Характарызаваць асноўныя тэндэнцыі рэгіянальнага культурнага развіцця, выдзяляць, фармуляваць і ацэньваць ключавыя напрамкі і асаблівасці развіцця розных этнакультурных рэгіёнаў;

БПК-7 Валодаць сучаснымі методыкамі вывучэння, актуалізацыі і інтэрпрэтацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Этналогія" студэнты павінны *ведаць*:

– прадмет даследавання вучэбнай дысцыпліны "Этналогія";
– прыёмы і аб'екты даследавання вучэбнай дысцыпліны "Этналогія";
– інфармацыйныя крыніцы ў дадзеным кірунку;
– методыку самастойнай работы з крыніцай і апрацоўкі інфармацыі;
– гістарычныя ўмовы развіцця этналогіі;
– методыку выкарыстання набытых ведаў у музейнай працы;
– навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне;

Студэнты павінны *ўмець*:

– выкарыстоўваць прыёмы і метады этналогіі;
– выкарыстоўваць даныя этналогіі пры правядзенні практычнай і навуковай работы;
– праводзіць навуковую апрацоўку музейных калекцый;
– выкарыстоўваць інфармацыйныя крыніцы ў музейнай працы;
– выкарыстоўваць найноўшыя навуковыя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў у дадзенай галіне ў фондавай і экспазіцыйнай музейнай рабоце.

Студэнты павінны *валодаць*:

– прафесійнымі навыкамі аналіза і выкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў у галіне этналогіі;
– навыкамі стварэння інфармацыйных прадуктаў розных відаў па тэме вучэбнай дысцыпліны.

Асноўнымі формамі навучання па вучэбнай дысцыпліне з'яўляюцца лекцыі і семінарскія заняткі, заданні для самастойнай работы студэнтаў.

Замацаванне атрыманых ведаў мае працяг пры праходжанні вучэбнай і вытворчай практыкі ў музеях краіны, у фондах, якіх знаходзяцца этнаграфічныя калекцыі.

Вучэбная праграма "Этналогія" распрацаваны з улікам пастаўленых задач і ўзгоднены з праграмамі іншых вучэбных дысцыплін – "Ахова

гісторыка-культурнай спадчыны", "Музеі Беларусі", "Крыніцазнаўства" і інш.

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія мэтазгодна - выкарыстоўваць пры выкладанні дысцыпліны, адносяцца:

- гісторыка-тэматычны падыход;
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; камунікатыўныя тэхналогіі;
- метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, разнастайныя варыянты самастойнай работы пад кіраўніцтвам выкладчыка, вучэбна-метадычныя комплексы. Для правядзення семінарскіх заняткаў варта выкарыстоўваць методыкі актыўнага навучання ,метад малых груп, дыскусійныя формы.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны "Этналогія" прадугледжана ўсяго 138 гадзін, з якіх 64 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 44 гадзіны, практычныя заняткі – 20 гадзін. Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне. Форма правядзення прамежкавай атэстацыі - залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Прадмет, мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны "Этналогія". Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме гістарычных дысцыплін. Сувязь вучэбнай дысцыпліны "Этналогія" з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі і асабліва з сацыяльна-гуманітарнымі і спецыяльнымі дысцыплінамі. Формы вучэбных заняткаў і кантролю. Крыніцы і методыка вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Этналогія".

### Раздзел I Класіфікацыя этнічных супольнасцей свету

### Тэма 1 Крыніцы і метады этналогіі

Крыніцы і метады этналагічных даследаванняў. Палявыя этнаграфічныя матэрыялы. Пісьмовыя крыніцы. Архіўныя і музейныя калекцыі. Дадзеныя сумежных навук:антрапалогіі, археалогіі, лінгвістыкі ,фалькларыстыкі і г.д. Метады збору і апрацоўкі этнаграфічнай інфармацыі.

### Тэма 2 Аб'ект, прадмет этналагічных даследаванняў

Этнічная тэрыторыя. Культура народаў як галоўны прадмет этналогіі. Этналагічны падыход да культуры. Этнас і мова. Этнічная свядомасць. Этнічныя стэрэатыпы паводзін. Этнонімы. Гістарычныя формы этнічных супольнасцей. Этнас у традыцыйным і індустрыяльным грамадствах. Праблема этнічных груп і міжэтнічных адносін. Этнічныя працэсы.

### Тэма 3 Класіфікацыя культур у этналогіі

Паняцце класіфікацыя. Прынцыпы класіфікацыі. Класіфікацыя этнічных супольнасцей паводле тэрыторыі пражывання. Паняцце гісторыка-культурных этнаграфічных абласцей. Вялікая, сярэдняя, малыя гісторыка-культурныя этнаграфічныя вобласці.

### Тэма 4 Класіфікацыя паводле падабенства фізічнага аблічча

Паняцце антрапалагічнага тыпу. Вялікія і малыя расы. Падзел рас на мясцовыя антрапалагічныя тыпы. Прычыны ўтварэння антрапалагічных тыпаў. Роля экалагічнага асяроддзя, ізаляцыі, змешвання. Узнікненне вялікіх рас (еўрапеоіднай, негроіднай, аўсаралоіднай ,манталоіднай, амерыканскай).

Змешаныя расавыя тыпы. Значэнне антрапалагічнай класіфікацыі.

### Тэма 5 Класіфікацыя этнічных супольнасцей паводле роднасці моў

Паняцце моўнай роднасці. Іерархія лінгвістычных супольнасцей.

Сусветныя лінгвістычныя сем'і. Лінгвістычныя групы. Значэнне лінгвістычнай класіфікацыі.

**Тэма 6 Класіфікацыя этнічных супольнасцей паводле падабенства гаспадаркі і матэрыяльнай культуры**

Паняцце гаспадарча-культурнага тыпу. Іерархія гаспадарча-культурнага тыпу. Іерархія гаспадарча-культурных тыпаў. Значэнне гаспадарча-культурнай класіфікацыі.

## Раздзел II. Гісторыя этналогіі

**Тэма 7 Этнаграфічныя веды на Старажытным Усходзе і ў антычным свеце**

Этнаграфічныя веды ў Старажытным Егіпце, Месапатаміі і Іране. Этналагічныя канцэпцыі ў Бібліі. Канцэпцыя залатога веку Гесіода. "Усход" і "Захад" Герадота, герадотавы "неўры". Ідэя антрапасацыягенезу ў Дэмакрата. "Геаграфічны дэтэрмінізм" Гіпакрата. Этналагічныя погляды Тацыта. Ідэі прагрэсу грамадства ў Лукрэцыя Кара.

**Тэма 8 Этнаграфічныя веды ў сярэдневяковай Еўропе**

Этнаграфічныя звесткі ў Іардана, Пракопія Кесарыйскага, Канстанціна Парфірагенета. Прагматычнае разуменне этнаграфіі ў Канстанціна Парфірагенета. Кніга Марка Пола і яе ўплыў на еўрапейскую навуковую думку.

**Тэма 9 Этнаграфічныя веды ў Еўропе XVI – першай палове XIX ст.**

Вялікія геаграфічныя адкрыцці і іх этналагічнае асэнсаванне. Канцэпцыя "шчаслівага дзікуна" П. Марціра. Ідэі гістарычнага працэсу Дж. Віко, Ж. Кандарсэ, А. Фергюсана. Французскія асветнікі: Д. Дзідро, Ф. Вальтэр, Ж.-Ж. Русо. Этналагічныя канцэпцыі І.Г. Гердэра: ідэя натуральнага паходжання моў і этнасаў, крытыка еўрапацэнтрызму. Філасофія нацыі І. Фіхтэ. Вучэнне аб мовах В. фон Гумбальда. Асноўныя ідэі "міфалагічнай школы". Я. і В. Грым, М. Мюлер, А. Кун.

**Тэма 10 Эвалюцыянізм і дысфузіянізм**

Эвалюцыянізм. Асноўныя пастулаты эвалюцыянізму Дж. Мак-Ленана. Канцэпцыя паходжання рэлігіі Д. Лебака. Канцэпцыя прагрэсу Э. Тэйлара. Анімістычная канцэпцыя паходжання рэлігіі Л.Г. Моргана. Позні эвалюцыянізм: Э. Хан, Д. Фрэзер і інш.

Дыфузіянізм. Сутнасць канцэпцыі. Вытокі: Ф. Ратцэль. Культурная

міфалогія Л. Фрабеніуса. "Культурнае кола" Ф. Грэбнера. Тэорыя "прамонатэізму" В. Шмідта. "Гіпердыфузіянізм" Г. Эліота-Сміта і У. Пэры. Сучасны дыфузіянізм: ідэі і эксперыменты Т. Хеердала.

### Тэма 11 Новыя накірункі ў этналогіі

*Французская сацыялагічная школа*: Э. Дзюркгейм, М. Мос, Л. Леві-Бруль.

*Функцыяналізм і структуралізм*: Б. Маліноўскі, А. Радкліф-Браўн. Прынцып "бінарных апазіцый". Вывучэнне сістэм сваяцтва. Метад К. Леві-Строса.

*Этнапсіхічны кірунак*: М. Лацарус, К. Лебон, В. Вунд. Этнаграфічныя сюжэты З. Фрэйда. Канцэпцыя "культурнага рэлятывізму" Ф. Боаса. "Культурныя патэрны" Р. Бенедыкт. Этнаграфія дзяцінства ў працах М. Мід.

### Тэма 12 Марксізм у этнаграфіі

Этнаграфічныя сюжэты ў К. Маркса і Ф. Энгельса. Тэорыя этнасу і этнічных працэсаў у працах Ю.У. Брамлея. "Інфармацыйнае" разуменне этнасу ў С.А. Аруцюнава. Тэарэтычная сістэма Л.М. Гумілёва. Канцэпцыя этнасферы і пасіянарнасці.

## Раздзел III. Этнічныя супольнасці свету

### Тэма 13 Этнічныя супольнасці Аўстраліі і Акіяніі

Абарыгены Аўстраліі, іх паходжанне ,антрапалагічны тып, мова. Матэрыяльная культура. Сацыяльная арганізацыя: племя, фратрыя, род, сям'я. Герантакратыя. Сістэма выхавання. Асаблівасці духоўнай культуры абарыгенаў Аўстраліі. Тасманійская праблема.

Этнічная супольнасці Меланезіі. Этнічны склад насельніцтва. Антрапалагічны тып. Асаблівасці сацыяльнай арганізацыі. Таемныя мужчынскія саюзы. Рэлігійныя вераванні. Уяўленні аб "мана". Этнасы папуа. Антрапалагічны тып. Феномен "бігмэнства". Татэмізм і культ продкаў.

Этнічныя супольнасці Палінэзіі. Этнічны склад. Антрапалагічны тып. Моўная сітуацыя. Сацыяльная арганізацыя. Дзяржаўныя ўтварэнні. Культ правадыроў. Табу.

Этнічныя супольнасці Мікранэзіі. Антрапалагічны тып. Асаблівасці гаспадаркі і матэрыяльнай культуры. Сацыяльная арганізацыя. Характар сям'і. Жаночыя саюзы. Духоўная культура. Пачатковая пісьменнасць. Своеасаблівасць рэлігіі. Элементы шаманізму. Фарміраванне англа-аўстралійцаў і англа-новазеландцаў.\

## Тэма 14 Этнічныя супольнасці Амерыкі

Праблема першапачатковага засялення Амерыкі. Моўная і антрапалагічная сітуацыя да Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Гаспадарча-культурныя тыпы Паўночнай Амерыкі. Арктычныя паляўнічыя і рыбаловы. Эскімосы і алеуты. Гаспадарчая дзейнасць і матэрыяльная культура. Рэлігія і прамысловыя культы. Збіральнікі Каліфорніі. Спецыфіка матэрыяльнай культуры. Рэлігійныя ўяўленні.

Паляўнічыя прэрый. Матэрыяльная культура. Племянная арганізацыя. Фарміраванне ваеннай дэмакратыі. Аседлыя рыбаловы паўночна-заходняга ўзбярэжжа. Спецыфіка прыродных умоў і іх уплыў на матэрыяльную культуру і сацыяльную арганізацыю. Патрыярхальнае рабства.

Ручныя земляробы. Паўночная Амерыка. Спецыфіка полаўзроставага падзелу працы і яе ўплыў на сацыяльную арганізацыю. Авачыра іракезаў. Індзейцы “пуэбла”. Родава-племянная сістэма. Спецыфіка рэлігійнага жыцця.

Гаспадарча-культурныя тыпы Паўднёвай Амерыкі. Земляробства. Марскія рыбаловы і збіральнікі. Асаблівасці антрапалагічнага тыпу. Сацыяльная арганізацыя. Паселішча і жыллё. Ваяўнічы характар культуры. Асаблівасці антрапалагічнага тыпу.

Цывілізацыі Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі. Цывілізацыя майя. Гарады-дзяржавы. Сацыяльная структура. Рэлігійны культ. Дзяржава ацтэкаў. Асаблівасці сацыяльнай структуры. Рэлігійны культ і яго ўплыў на характар усёй цывілізацыі. Імперыя інкаў. Асаблівасці гаспадарчай базы інкскай цывілізацыі. Сацыяльна-каставы строй. Сістэма трансляцыі інфармацыі. Кіпу. Выявы ў пустыні Наска. Фарміраванне сучаснага насельніцтва Амерыкі.

## Тэма 15 Этнічныя супольнасці Афрыкі

Антрапалагічны склад насельніцтва. Еўрапеоіды. Негроіды. Негрыльскі, эфіопскі і бушменскі расавыя тыпы. Лінгвістычная сітуацыя. Гістарычна-культурныя рэгіёны. Этнічная гісторыя: кароткі агляд. Гаспадарча-культурныя тыпы трапічнай і Паўднёвай Афрыкі.

Паляўнічыя і збіральнікі. Негрылы. Паселішча і жыллё. Грамадскія адносіны. Рэлігія: прамысловыя культы. Бушмены. Сацыяльная арганізацыя. Рэлігійныя культы. Мастацкая культура.

Жывёлаводы. Фульбэ, туарэгі, масаі, гатэнтоты. Агульная характарыстыка афрыканскай жывёлагадоўлі. Матэрыяльная культура. Каставы строй. Становішча жанчыны. Духоўная культура.

Ручныя земляробы трапічных лясоў і саван. Тэхналогія культуры земляробства. Сезонны характар земляробства. Рамёствы. Ткацтва.

Паселішча і жыллё. Адзенне. Сацыяльная структура. Таемныя мужчынскія і жаночыя саюзы. Рэлігійныя ўяўленні. Культ продкаў. Фетышызм.

Этнасы Паўночнай і Паўночна-Усходняй Афрыкі. Асаблівасці земляробства ў даліне Ніла. Садаводства ў краінах Магрыба. Рамёствы. Рэлігійная сітуацыя. Рэшткі даісламскіх культаў. Хрысціяне-копты. Спецыфіка традыцыйнай культуры народаў Паўночна-Усходняй Афрыкі.

## Тэма 16 Этнічныя супольнасці Азіі

Этнасы Заходняй Азіі. Этнічны склад насельніцтва. Лінгвістычная і антрапалагічная сітуацыя. Традыцыйная матэрыяльная культура. Паселішча. Жыллё. Іслам і яго ўплыў. Спецыфіка сацыяльнага жыцця і духоўнай культуры яўрэяў. Інстытут равіната. Традыцыйныя абрады і святы яўрэяў.

Этнічныя супольнасці Паўднёвага Каўказа. Антрапалагічная і лінгвістычная характарыстыка. Рэлігія. Матэрыяльная культура. Паселішчы і жыллё. Патрыярхальны характар сямейных адносін.

Этнічныя супольнасці Сярэдняй Азіі. Этнічны склад насельніцтва. Лінгвістычная і антрапалагічная сітуацыя. Традыцыйныя формы гаспадарчых заняткаў. Феномен махаля.

Этнічныя супольнасці Паўднёвай Азіі. Этнічная гісторыя. Этнічная, антрапалагічная і лінгвістычная сітуацыя. Гаспадарча-культурныя тыпы: паляўнічыя і збіральнікі, ручныя земляробы, жывёлаводы. Паходжанне індуізму. Брахманізм і каставы лад грамадства. Асноўныя прынцыпы джайнізму і будызму.

Народы Паўднёва-Усходняй Азіі. Этнічная, антрапалагічная і лінгвістычная сітуацыя. Гаспадарча-культурныя тыпы. Паляўнічыя і збіральнікі (кубу, семангі). Ручныя земляробы (сеноі, даякі і гд.). Рамёствы. Паселішча і жыллё. Традыцыйныя святы.

Этнічныя супольнасці Усходняй Азіі. Этнічная, антрапалагічная і лінгвістычная сітуацыя. Кітайская мова і феномен іерагліфічнай пісьменнасці, яго роля ў развіцці культуры народаў рэгіёна. Этнічная гісторыя.

Гаспадарча-культурныя тыпы. Айны – аседлыя рыбаловы і збіральнікі . Айнскі антрапалагічны тып. Спецыфіка гаспадаркі і матэрыяльнай культуры. Жавёлаводы Цэнтральнай Азіі. Паселішча, жыллё. Харчаванне. Адзенне. Духоўная культура манголаў. Кітайцы, карэйцы, японцы. Рамёствы. Паселішчы і жыллё. Спецыфіка рэлігійных уяўленняў кітайцаў. Асноўныя прынцыпы даасізму. Астралогія і геамантыя. Канфуцыянства. Сямейна-родавыя культы. Спецыфіка духоўнай культуры японцаў. Дзэн-будызм і яго ўплыў на фарміраванне японскага светапогляду і эстэтычных прынцыпаў.

Этнічныя супольнасці Сібіры. Лінгвістычная і антрапалагічная сітуацыя. Традыцыйныя гаспадарча-культурныя тыпы. Жывёлаводы і земляробы Заходняй Сібіры, Алтаю і Прыбайкалля. Аседлыя рыбаловы. Паляўнічыя-аленяводы лясной зоны. Аленяводы тундры. Арктычныя паляўнічыя. Шаманізм. Сямейна-родавыя культы. Прамысловыя культы. Змены ў жыцці народаў Сібіры ў сувязі з яе каланізацыяй.

**Тэма 17 Этнічныя супольнасці Еўропы**

Класіфікацыя этнічных супольнасцей Еўропы: антрапалагічная, лінгвістычная, гаспадарча-культурная. Гісторыка-культурныя вобласці. Этнічныя супольнасці Заходняй Еўропы. Этнічная гісторыя і сучасная этнапалітычная сітуацыя ў буйнейшых краінах Заходняй Еўропы. Этнічныя праблемы Італіі, Іспаніі, Францыі, Вялікабрытаніі, Бельгіі, Славакіі, Румыніі, югаслаўскі крызіс. Раманскія народы Заходняй Еўропы. Традыцыйная матэрыяльная і духоўная культура. Германскія народы. Гістарычны лёс кельтаў. Фальклор і музычнае мастацтва. Сучаснае кельтскае адраджэнне.

Этнічныя супольнасці заходніх і паўднёвых славян. Гаспадарка, плужнае земляробства. Агародніцтва, садаводства. Жывёлагадоўля. Пчалярства. Рыбалоўства. Развіццё прамысловасці. Урбанізацыя. Тыпы сельскіх пасяленняў. Тыпы жылля. Традыцыйны касцюм. Грамадскія і сямейныя традыцыі. “Задруга” паўднёвых славян. Малая сям’я.

Этнічныя супольнасці Усходняй Еўропы. Народы Прыбалтыкі. Эстонцы. Сету. Традыцыйныя заняткі. Тэхналогія земляробства і культуры. Рыбалоўства. Паселішча і жыллё. Адзенне. Ежа. Традыцыйныя святы. Латышы. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны. Традыцыйная матэрыяльная культура. Летувісы. Этнічная гісторыя. Гісторыка-этнаграфічны падзел. Жэмайцiя і Аўкшайцiя. Традыцыйная матэрыяльная культура. Падабенства матэрыяльнай і духоўнай культуры літоўцаў і беларусаў.

Этнічныя супольнасці Беларусі. Месца ў сістэме лінгвістычнай і антрапалагічнай класіфікацыі. Этнічныя меншасці. Рускія. Палякі. Украінцы. Яўрэі. Татары. Іншыя этнічныя групы. Паходжанне і асаблівасці культуры. Традыцыі міжэтнічных адносін у Беларусі.

Этнічныя супольнасці Украіны і Малдовы. Украінцы. Праблема паходжання, антрапалагічны тып, дыялектныя адрозненні. Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны. Традыцыйныя заняткі. Земляробства: тэхналогія і асноўныя культуры. Рамёствы. Паселішча і жыллё. Адзенне. Спецыфіка ўкраінскага харчавання. Традыцыйная духоўная культура. Крымскія татары. Праблема паходжання і гістарычны лёс. Традыцыйная культура. Малдаване. Паходжанне. Спецыфіка гаспадаркі. Паселішча і жыллё. Гагаузы.

Этнічныя супольнасці Поўначы Усходняй Еўропы. Этнічны, антрапалагічны і лінгвістычны склад. Саамы. Спецыфіка традыцыйнай культуры. Карэлы. Паходжанне. Этнаграфічныя групы. Традыцыйныя заняткі. Земляробства. Паселішча, жыллё. Адзенне. Комі-зыряне і Комі-пермякі. Спецыфіка гаспадарчай дзейнасці. Традыцыйныя рэлігійныя вераванні.

Этнічныя супольнасці Еўрапейскай Расіі. Дыялектны і гісторыка-этнаграфічны падзел. Казакі, паморы, аднадворцы, мешэра, палехі, саяны і г.д. Стараверы. Традыцыйныя заняткі. Спецыфіка земляробства і жывёлагадоўлі. Рамёствы. Паселішчы і жыллё. Адзенне. Ежа. Сацыяльныя адносіны. Калым. Рэшткі язычаскіх вераванняў.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| 1 | Уводзіны | 2 | | | |
| **Раздзел І Класіфікацыя этнічных супольнасцяў свету** | | | | | |
| 2 | Тэма 1 Крыніцы і метады этналогіі | 2 | | | |
| 3 | Тэма 2 Аб'ект, прадмет этналагічных даследаванняў | 2 | 2 | | |
| 4 | Тэма 3 Класіфікацыя культур у этналогіі | 2 | | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя прэзентацыя |
| **Раздзел ІІ Гісторыя этналогіі** | | | | | |
| 5 | Тэма 4 Этнаграфічныя веды на Старажытным Усходзе і ў антычным свеце | 4 | 2 | | |
| 6 | Тэма 5 Этнаграфічныя веды ў сярэдневяковай Еўропе | 2 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя прэзентацыя |
| 7 | Тэма 6 Этнаграфічныя веды ў Еўропе XVI – першай палове XIX ст. | 4 | | | |
| **Раздзел ІІІ Этнічныя супольнасці свету** | | | | | |
| 8 | Тэма 7 Этнічныя супольнасці Аўстраліі і Акіяніі | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя прэзентацыя |
| 9 | Тэма 8 Этнічныя супольнасці Амерыкі | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, мультымедыя |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | прэзентацыя |
| 10 | Тэма 9 Этнічныя супольнасці Афрыкі | 4 | 2 | | |
| 11 | Тэма 10 Этнічныя супольнасці Азіі | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, тэставае заданне, пісьмовая работа, мультымедыя прэзентацыя |
| 12 | Тэма 11 Этнічныя супольнасці Еўропы | 4 | 2 | 2 | выбарачнае апытанне, мультымедыя прэзентацыя |
| Разам | | 36 | 16 | 12 | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

Асноўная літаратура

1. Садохин, А. П. Основы этнологии : учебное пособие / А. П. Садохин, Т. Г. Грушевицкая. – Москва : Юнити-Дана, 2017. – 352 с. : ил. – (Cogito ergo sum). – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=685446.

2. Этналогія Беларусі : традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве : вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях 1-21 03 01 "Гісторыя (па напрамках)", 1-23 01 12 "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)" / Т. А. Навагродскі [и др.]. - Мінск : БДУ, 2009. - 333, [2] с., [12] л. каляр. іл. : іл.

Дадатковая літаратура

1. Итс, Р. Ф. Введение в этнографию : учебное пособие / Р. Ф. Итс. - Изд. 2-е, испр. и доп. - Ленинград : Издательство Ленинградского университета, 1991. - 168, [1] с.

2. Харузина, В. Н. Введение в этнографию / В. Н. Харузина. - Москва : Юрайт, 2022. - 189, [2] с.

3. Народы мира : историко-этнографический справочник / Институт этнологии и антропологии имени Н. Н. Миклухо-Маклая ; гл. ред. Ю. Б. Бромлей. - Москва : Советская энциклопедия, 1988. - 624 с.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне. Для дыягностыкі атрыманых студэнтамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– тэставыя заданні па асобных падраздзелах і дысцыпліне ў цэлым;

– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне экзамену.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падразделах вучэбнай дысцыпліны, вывучэння дадатковых крыніц і літаратуры, падрыхтоўцы да экзаменуі інш.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

– фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;

– засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;

– развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з’яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама падчас правядзення экзамену.

## Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Этналогія» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання студэнтаў: лекцыйныя і семінарскія заняткі, а таксама элементы самастойнай работы.